УДК 94(476)
ББК 63.(4 Беи)
С916

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ

Рэдкалегія:
старшыня арганізацыйнага камітэта канферэнцыі, доктар гістарычных навук, прафесар, дэкан гістарычнага факультэта БДПУ *М.М. Забаўскі*;
доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі БДПУ *А.П. Жытко* (навук. рэд.);
доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі новага і навейшага часу БДПУ *Г.А. Космач*;
доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі Беларусі БДПУ *А.М. Люты*;
доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры айчыннай і сусветнай гісторыі БДПУ *В.А. Пілецкі*;
доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі старажытных цывілізацый і сярэднявечча БДПУ *У.В. Тугай*;
доктар гістарычных навук, прафесар кафедры гісторыі старажытных цывілізацый і сярэднявечча БДПУ *М.І. Мініцкі*;
доктар гістарычных навук, прафесар кафедры гісторыі Беларусі БДПУ *М.К. Сакалоў*;
доктар гістарычных навук, прафесар кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі БДПУ *В.М. Фамін*;
доктар гістарычных навук, прафесар кафедры гісторыі новага і навейшага часу БДПУ *І.Р. Чыкалава*;
начальнік Вучэбна-выдавецкага цэнтра БДПУ *В.Я. Навагродскі*

**Сучасныя** падыходы да вывучэння крыніц па гісторыі Беларусі. Да 1000-годдзя
С916 летапіснай Літвы: матэрыялы Рэсп. навук.-тэарэт. канф., г. Мінск, 18 снеж. 2009 г. / Бел. дзярж. пед. ун-т імя М. Танка; рэдкал. М.М. Забаўскі, А.П. Жытко (навук. рэд.), Г.А. Космач і інш. – Мінск: БДПУ, 2009. – 248 с.
ISBN 978-985-501-841-5.

У матэрыялах канферэнцыі разглядаюцца сучасныя падыходы да вывучэння крыніц па актуальных пытаннях сацыяльна-эканамічнай і палітычнай гісторыі Беларусі са старажытных часоў да сучаснасці.

Адрасуецца навукоўцам, выкладчыкам, студэнтам вышэйшых навучальных устаноў і ўсім, хто цікавіцца праблемамі айчыннай гісторыі.

**УДК 94(476)**
**ББК 63.(4 Беи)**

ISBN 978-985-501-841-5

© БДПУ, 2009

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка»

Гістарычны факультэт

# СУЧАСНЫЯ ПАДЫХОДЫ ДА ВЫВУЧЭННЯ КРЫНІЦ ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

## *ДА 1000-ГОДДЗЯ ЛЕТАПІСНАЙ ЛІТВЫ*

*Матэрыялы Рэспубліканскай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі*
г. Мінск, 18 снежня 2009 г.

Мінск 2009

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

набліжаных да Ізяслава. Складваецца ўражанне, што ўсё гэта апісана з асабістага назірання. Гэта адзначаюць Б.А. Рыбакоў [7, с. 211], П.П. Талочка [9, с. 40] і інш. Зноў даецца падрабязная дата гэтых падзей: 15 верасня 6576 г. (1068 г.) Усяслаў становіцца князем Кіеўскім. Нікан у чарговы раз падкрэслівае, што падзеі гэтыя з'явіліся вынікам парушэння Яраславічамі крыжацалавання: «Се же Богъ яви силу крестную, понеже Изяславъ целовав крест и яша и; тем же наведе Богъ поганыя. Сего же яве», – працягвае летапісец, – «избави крестъ честныи: в день бо Въздвиженья Всеславъ, вздохнувъ, рече: «о кресте честныи, понеже к тобе веровах, избави мя от рва сего» [5, с. 172]. Ці гаварыў гэта Усяслаў? Хутчэй не. Летапісцы іншы раз укладвалі свае думкі ў вусны іх герояў. Цалкам верагодна, што Нікан прыпісвае свае думкі Усяславу. Але адно можна гаварыць упэўнена – постаць Усяслава выклікае ў аўтара толькі павагу.

Такім чынам, мэтай паездкі манаха Кіева-Пячорскага манастыра Нікана ў Полацк у 6575 г. (1067 г.) было выкананне ім дыпламатычнай місіі. Ён павінен быў пераканаць князя Полацкага Усяслава пайсці на перамовы з Ізяславам і яго братамі Святаславам і Усеваладам.

Князь Полацкі зрабіў вельмі станоўчае ўражанне на Нікана – гэта бачна па тым, што ў той частцы летапісу, якая прыпісваецца Нікану, няма ніводнага радка, у якім бы Усяслаў быў паказаны адмоўна. Полацкі князь паказаны або станоўча, або нейтральна. Аб прычынах такіх прыязных адносін у летапісе прама не гаворыцца. Але можна меркаваць, што вельмі важным для Нікана было тое, што Усяслаў пабудаваў Полацкі Сафійскі сабор. Цалкам верагодна, што ў князя Полацкага Усяслава былі далейшыя планы ў рэлігійным будаўніцтве, развіцці асветы. Аб гэтым можна гаварыць дастаткова ўпэўнена, ведаючы пазнейшую гісторыю Полацкага княства, памятаючы пра дзейнасць Еўфрасінні Полацкай.

**Літаратура**


1. Гісторыя Беларусі: у 6 т.– Мінск: Экаперспектыва, 2000. – Т. 1. Старажытная Беларусь: Ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. – 351 с.; іл.
2. Заяц, Ю.А. Полоцкий князь Всеслав и Ярославичи в 1065 – 1066 г.: от Пскова до Белгорода / Ю.А.Заяц // Інстытут гісторыі АН Беларусі. Гістарычна-археалагічны зборнік. № 4. Сярэдневечча. – Мінск: Інстытут гісторыі АН Беларусі, 1994. – С. 88 – 113.
3. Зиборов, В.К. О летописи Нестора /В.К.Зиборов. – СПб.: Издательство С.-Петербургского университета, 1995. – 192 с.
4. Никитин, А.Л. Инок Илларион и начало русского летописания. Исследования и тексты / А.Л. Никитин. – М.: Аграф, 2003. – 320 с.
5. Полное собрание русских летописей. – Т. 1. Лаврентьевская летопись. – М.: Издательство восточной литературы, 1962. – 580 с.
6. Пронштейн, А.П. Методика исторического источниковедения / А.П. Пронштейн. – изд. 2-е, доп. и исп. – Ростов н/Д: Издательство Ростовского университета, 1976. – 479 с.
7. Рыбаков, Б.А. Древняя Русь. Сказания. Былины. Летописи / Б.А. Рыбаков. – М.: Издательство АН СССР, 1963. – 362 с.





8. Тарасаў, С.В. Чарадзей сёмага веку Траяна. Усяслаў Полацкі / С.В. Тарасаў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1991. – 127 с.
9. Толочко, П.П. Русское летописание и летописцы X–XIII вв. / П.П. Толочко. – СПб.: Алетейя, 2003. – 296 с.


## ДА ПЫТАННЯ АБ ГІПАТЭТЫЧНЫМ ТУРАЎСКІМ ЛЕТАПІСЕ

**М.Ф. Бандзелікаў (г. Мінск, БДПУ, дацэнт)**

Летапісы займаюць вельмі важнае месца сярод крыніц па гісторыі Беларусі XI–XVI стст. На падставе інфармацыі летапісаў вырашаюцца асноўныя пытанні палітычнай, эканамічнай і сацыяльнай гісторыі.

Гісторыкі, на вялікі жаль, не маюць ніводнага рукапісу летапісаў раней за XIV ст. Гэта тычыцца нават такога знакамітага, вельмі папулярнага ў свой час летапісу, які вядомы пад умоўнай назвай «Аповесць мінулых гадоў». Гэты летапіс, створаны ў Кіева-Пячорскім манастыры каля 1113 г. (?) і пакладзены ў аснову іншых усходнеславянскіх летапісаў, дайшоў да нас, як вядома, у складзе пазнейшых летапісных зводаў, самы ранні з якіх – Лаўрэнцьеўскі летапіс 1377 г.

Як мяркуюць гісторыкі, у XII–XIII стст. пачынаецца летапісная работа і на беларускіх землях. Сярод гіпатэтычных летапісаў гэтага перыяду ў навуковай і вучэбнай літаратуры называецца таксама Тураўскі летапіс ці нават тураўскія летапісы [3, с.14–15]. Як вядома, на сённяшні дзень не выяўлены ў пазнейшых летапісных зводах фрагменты, якія можна было б аднесці да так званага Тураўскага летапісу. Няма ў крыніцах і якіх-небудзь згадак аб існаванні ў старажытным Тураве летапіснай работы.

У падтрымку таго, што такая работа магла тут весціся, прыводзіцца шэраг аргументаў, якія павінны абгрунтаваць наяўнасць летапіснай работы ў Тураве [3, с. 14–15]. Сярод іх называецца тое, што ў Тураве была адна са старэйшых на Русі епіскапій – як вядома, епіскапы часта з'яўляліся ініцыятарамі летапіснай работы. Тут было дастаткова шмат манастыроў, а менавіта пры манастырах зараджаецца летапісанне. Пры двары тураўскага князя Святаполка Ізяславіча (князь Тураўскі з 1088 г., а з 1093 г. – вялікі князь Кіеўскі) і яго жонкі, візантыйскай прынцэсы Варвары, знаходзілася культурнае кола людзей, сярод якіх летапісная работа была б запатрабаванай. Светаполк Ізяславіч быў «…аматарам кніг…» [3, с. 14], а як вядома, князі дастаткова часта выступаюць ініцыятарамі стварэння летапісаў. У якасці доказу магчымага летапісання прыводзіцца тое, што ў Тураве былі знойдзены рэшткі Тураўскага евангелля (10 лістоў) XI ст. – старажытнейшага на тэрыторыі Беларусі рукапісу. Археолагі знайшлі тут пісала, кніжныя зашпількі. Важкім аргументам на карысць таго, што ў Тураве магла весціся летапісная работа, называецца дзейнасць Кірыла, епіскапа Тураўскага. Кірыл Тураўскі вядомы як буйны пісьменнік, аратар, рэлігійны і грамадскі дзеяч XII ст. Ён з'яўляецца аўтарам шырока вядомых у тагачасным грамадстве малітваў, словаў, павучэнняў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Але прыведзеныя факты сведчаць толькі аб тым, што ў Тураве было амаль усё для таго, каб тут узнікла летапісанне. Тым не менш трэба прызнаць, што летапісанне ў Тураве ўзнікнуць не магло. Як паказвае прыклад Наўгародскага, Уладзімірскага, а пазней – Пскоўскага, Галіцка-Валынскага і іншых княстваў (у гэты пералік можна дастаткова упэўнена ставіць і княства Полацкае), імпульс да пачатку летапіснай работы дае, перш-наперш, імкненне сцвердзіць сваю незалежнасць, самастойнасць.

Можна пагадзіцца з тым, што на пачатку існавання Тураўскага княства, калі тураўскі прастол атрымаў Святаполк Уладзіміравіч – трэці па старшынстве сын Уладзіміра Святаславіча, Тураў сапраўды быў трэцім па значэнні пасля Ноўгарада і Полацка.

Яшчэ пры жыцці Уладзіміра Святаславіча мы назіраем, што яго сыны, якія атрымалі ад бацькі ўдзельныя княжанні, з аднаго боку намагаюцца быць незалежнымі ад Кіева, а з другога – кожны з іх мае на мэце атрымаць кіеўскі прастол. Да прыкладу можна прывесці паведамленне летапісу аб тым, што Яраслаў Уладзіміравіч, князь Наўгародскі, у лета 6522 (1014 г.) перастаў плаціць Кіеву звычайную дань [5, стб. 115]. Але адразу ж, як толькі Яраслаў Уладзіміравіч атрымаў паведамленне аб смерці бацькі, ён пачынае змагацца за кіеўскі прастол, хаця незадоўга да гэтага спрабуе сцвердзіць незалежнасць ад Кіева Наўгародскага княства.

Тое самае тычыцца і тураўскіх князёў. Тураўскі князь Святаполк Уладзіміравіч яшчэ раней за Яраслава выступіў супраць Кіева з сепарацісцкімі, як мяркуюць навукоўцы, памкненнямі [1, с. 172]. Але пасля смерці Уладзіміра, якая здарылася 15 ліпеня 1015 г., Святаполк Уладзіміравіч займае кіеўскі прастол.

У першым томе шасцітомнай «Гісторыі Беларусі» сцвярджаецца, што паражэнне Святаполка ад Яраслава ў барацьбе за вялікакняжацкі прастол "прывяло да страты самастойнасці Тураўскага княства" [1, с. 173]?! Але ж ці была яна, гэтая самастойнасць? Як можна страціць тое, чаго не было? Нельга ж думаць, што калі Святаполк стаў князем Кіеўскім, то гэтым самым ён падпарадкаваў Кіеў Тураву. З упэўненасцю можна гаварыць, што перамога Святаполка ў барацьбе з Яраславам прыводзіла Тураў, зноў жа, да залежнасці ад Кіева.

У навуковай літаратуры падкрэсліваецца, што Тураўскае княства займала важнае месца сярод княстваў Кіеўскай Русі [3, с. 12]. Пачынаючы ад Уладзіміра Святаславіча Тураўская зямля давалася аднаму са старэйшых сыноў вялікага князя Кіеўскага. Аднак ствараецца ўражанне, што Тураў быў важным толькі ў тым сэнсе, што размяшчаўся непадалёку ад Кіева. Тураўскае княжанне часта было як бы прыступкай на шляху да вялікакняжацкага прастола. Тураўскія князі не аднойчы пераходзілі на кіеўскі вялікакняжацкі прастол. Як ужо адзначалася, у 1015 г. гэта зрабіў Святаполк Уладзіміравіч, пазней, у 1054 г. – Ізяслаў Яраславіч, у 1093 г. – Святаполк Ізяславіч, у 1139 г. – Вячаслаў Уладзіміравіч.

У XII ст., акрамя Полацкага княства, якое адасобілася раней, незалежную, самастойную палітыку праводзяць Наўгародскае, Уладзімірскае, Разанскае,



Чарнігаўскае, Смаленскае, Галіцка-Валынскае і іншыя княствы [4, с. 82]. Падобна на тое, што Тураўскае княства ў гэты пералік магло ўвайсці толькі з вялікімі агаворкамі. У 1162 г. была адноўлена адносная і досыць абмежаваная самастойнасць Тураўскага княства. Але яно, як і раней, амаль цалкам падпарадкоўваецца Кіеву. Па патрабаванні вялікага князя Кіеўскага тураўскія князі неаднойчы прымаюць удзел у яго ваенных паходах. Ці ж гэта не сведчанне залежнага становішча Турава? Тураўскія князі пасля сваёй смерці знаходзяць вечны спачын у Кіеве, а не ў Тураве, што таксама сімвалічна – гэта ўжо паказчык самасвядомасці кіруючых колаў Турава. Характэрным у гэтым сэнсе з'яўляецца тое, што тураўскімі князямі ў Кіеве былі ўзведзены Дзмітрыеўскі манастыр з царквамі святога Пятра і святога Міхаіла і, магчыма, Турава бажніца [3, с. 226].

Паступова роля і значэнне Турава яшчэ болей памяншаецца. Трэба заўважыць, што памяншаецца яна разам з роляй Кіева, толькі ў значна большай ступені. Калі за X–XII стст. летапісы змяшчаюць толькі ўрывачныя звесткі аб Тураве, то ўжо за XIII ст. летапісы наогул не згадваюць аб Тураве. Аўтар адной з пролагавых рэдакцый жыція Кірыла, епіскапа Тураўскага, якая створана, магчыма, у XIV–XV стст., ужо вымушаны ўказваць сваім чытачам, дзе знаходзіцца Тураў – «…иже есть близ Киева…» («…што паблізу Кіева…») [2, с. 62–64].

Такім чынам, трэба прызнаць, што кіруючым колам Турава бракавала галоўнага для пачатку летапісання – імкнення да палітычнай самастойнасці, незалежнасці ад Кіева. Таму ў Тураве ні ў XI ст., ні ў XII ст., а тым больш у пазнейшы час летапісы не ствараліся.

Узнікненне летапісання, «пісанай» гісторыі – а ў тыя часы летапісанне адыгрывала таксама і ролю публіцыстыкі – гэта яскравы паказчык імкнення «мясцовых» – гэта слова свядома бярэм у кавычкі – княстваў да палітычнай незалежнасці, самастойнасці. У сувязі з гэтым наўрад ці карэктна, як гэта прынята ў навуковай літаратуры, гаварыць аб летапісанні, якое пачынаецца ўслед за Кіеўскім у Наўгародскім, Уладзімірскім, Пскоўскім і іншых самастойных, незалежных ад Кіева княствах, як аб мясцовым. Гэта ўжо не мясцовыя княжанні, а незалежныя княствы.

### Літаратура


1. Гісторыя Беларусі: у 6 т. – Мінск: Экаперспектыва, 2000. – Т. 1. Старажытная Беларусь: Ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст – 351 с.; іл.
2. Кніга жыцій і хаджэнняў: пер. са старажытнарус., старабеларус. і польск. – Мінск: Маст. літ., 1994. – 503 с.; іл.
3. Лысенко, П.Ф. Туровская земля IX – XIII вв. / П.Ф. Лысенко. – 2-е изд. – Минск: Белорусская наука, 2001. – 268 с., ил.
4. Оргиш, В.П. Древняя Русь: Образование Киевского государства и введение христианства / В.П. Оргиш. – Минск: Наука и техника, 1988. – 150 с.
5. Полное собрание русских летописей. – М.: Издательство восточной литературы, 1962. – Т. 2. Ипатьевская летопись. – 939 с.




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ